Кроме того, в печати появляются публицистические статьи Максима Богдановича на русском языке, посвящённые вопросам истории литературы, национальным и общественно-политическим проблемам.

Летом 1916 года, закончив лицей, Максим Богданович вернулся в Минск. Хотя он был уже тяжело болен, но много работал в Минской губернском продовольственном комитете и в Белорусском комитете помощи жертвам войны, а свободное время отдавал литературному творчеству. Организует кружки молодёжи, которым старается придать общественно-просветительный и национально-революционный характер.

В это время Максим Богданович написал такие знаменитые произведения, как «*Потерянный лебедь*» и «*Погоня*».

В феврале 1917 года друзья поэта собрали деньги, чтобы он мог ехать в Крым лечиться от туберкулёза. Но лечение не помогло.

Умер Максим Богданович на рассвете 13 (25) мая 1917 года в возрасте 25 лет.

Произведения поэта переведены на два десятка языков мира, публиковались в Великобритании, Германии, Польше, России, Франции, Югославии и других странах.Ещё в 1950-е годы в Москве был издан большой сборник его избранных произведений на русском языке в переводе лучших советских поэтов.

В 1991—1995 годах издано полное собрание сочинений поэта в трёх томах.

## СЕКЦЫЯ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА І КУЛЬТУРА»

## ГІСТОРЫЯ ЎЗНІКНЕННЯ БЕЛАРУСКАГА СЦЯГА

*УА “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”*

*Андруконіс В.Г., 4 к., 3 гр., ЛФ*

*Кафедра рускай і беларускай моў*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.*

Многія этнографы і знаўцы беларускага арнаменту папярэджвалі: “Калі возьмешся пісаць пра арнамент, што выяўлены на сцягу Беларусі, будзь асцярожны – малюнак арнаменту вельмі старажытны і ў розныя перыяды гісторыі абазначаў паняцці, магчыма, зусім супрацьлеглыя тым, якія мы бачым у ім сёння”. Выбар тэмы канкрэтнага артыкула абумоўлены супраціўнымі меркаваннямі, звязанымі з арнаментам, так як цэласнага меркавання аб гісторыі з’яўлення менавіта гэтага арнаменту і менавіта на сцягу Беларусі да цяперашняга часу няма.

Мэтай даследавання стаў разгляд асноўных ідэй узнікнення



Репозиторий ГрГМУ

арнаменту на беларускім сцягу, так як нясе ў сабе старажытную і нацыянальную культуру традыцый, што дайшлі ад продкаў і сталі нацыянальным сімвалам.

У ходзе працы ў якасці матэрыялаў выкарыстоўваліся артыкулы беларускіх, а таксама расійскіх гісторыкаў; даныя з архіва Музея старажытнай беларускай культуры.

Калі арнамент у 1951 годзе ўпершыню з'явіўся на сцягу БССР, малюнак яго быў белым на чырвоным фоне. Пэўна, маскоўскія мастакі, якія распрацоўвалі канчатковыя эскізы "камплекта" сцягаў для ўсіх рэспублік СССР, проста не ведалі, як у залежнасці ад абставін нашы продкі з Палесся насілі той пояс, з якога быў ўзяты арнамент. Дызайнерскае мысленне падказала ім – для таго, каб беларускі сцяг "не выпадаў" з усяго відэараду сцягоў іншых рэспублік, арнамент трэба адлюстроўваць белым на чырвоным фоне. Яны і не ведалі нават, што паясы з такой выявай (ізнанкай наверх) было прынята насіць у дні смутку, а па святам наадварот – чырвоны малюнак павінен быць на белым фоне. Тым не менш вучоныя і спецыялісты, хто распрацоўваў цяперашні сцяг, улічылі ўсе нюансы. Таму каляровае рашэнне арнаменту на сцягу выключна пазітыўнае.

У аснове арнаменту на сцягу ляжыць узор "Узыходзячае сонца", вытканы ў 1917 годзе Матронай Маркевіч, сялянкай вёскі Касцелішча сучаснага Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Ён быў знойдзены ў архівах Белпрамсавета і прызначаўся для жаночага адзення.

Асноўны элемент – размешчаны ў цэнтры арнаменту ромб. Ён з'яўляецца старажытным сімвалам узыходзячага сонца. Фігуры справа і злева ад ромба – сімвал дабрабыту і багацця. Дзве крыжападобныя перасечаныя лініі з чатырма кропкамі паміж імі ўнутры ромба азначаюць засеянае поле. Вядомы вучоны Барыс Рыбакоў спасылаецца на старажытны іерогліф, які абазначае поле і прыводзіць запісы этнографа В. Багданава пра традыцыі ў Беларусі ў XIX веке асвячаць месца будучага маёнтка для новай сям'і, згодна якому глава сям'і павінен быў асвяціць квалак зямлі будучага жылля. Для гэтага ён чарціў на зямлі вялікі квадрат, разбіваў яго на чатыры роўныя квадраты і адпраўляўся ва "ўсе чатыры бакі". Затым браў з чатырох палёў па вялікім камені і клаў у цэнтры кожнага квадрата. Пасля гэтага зямля лічылася асвечанай. Таксама цэнтральны ромб называюць "Ключом да шчасця", які абазначае пажаданне спрыяльнага развіцця падзей.

Характэрны малюнак ромба з "рожкамі" з'явіўся ў часы мезаліту (10 6 тыс.год назад), яшчэ ў даіндаеўрапейскі перыяд гісторыі зямлян. Ужо тады гэта была графічна зашыфраваная выява парадзіхі (па вераваннях, напэўна, усіх людзей каменнага века, маці ўсяго жывога на Зямлі). Захаваліся і больш рэалістычныя выявы парадзіх. На неалітычных петрагліфах Чалмы-Варрэ, што на Кольскім паўвостраве, парадзіхі нараджаюць як людзей, так і… ласят. Жанчыны-ласіхі тут – сімвал жыцця. Здзіўляцца не трэба – так уяўлялі сабе з'яўленне ўсяго жывога на зямлі



Рэпазіторый ГрГМУ

нашы продкі. Яны думалі, што і самі вядуць свой род ад якой-небудзь жывёлы: адны ад аленей, другія ад ласёў, трэція ад мядзведзяў. Паколькі ў нашым арнаменце “рожкі” на цэнтральным ромбе прысутнічаюць, малюнак яго, магчыма, з’явіўся яшчэ ў тыя часы, калі на тэрыторыю сучаснай Беларусі прыйшлі першыя пасля пасля апошняга заледзянення Еўропы паляўнічыя на паўночных аленяў (12 тыс.гадоў назад). Форма ромба, дарэчы, мае і прыроднае ўтварэнне – абрублены бівень маманта на зрэзе ўжо мае натуральны ўзор з ромбаў, так што можна казаць, што адна з першых выяў, якой чалавек пачаў упрыгожваць прадметы працы і побыту, быў ромб… Перакрыжаванне з чатырма кропкамі, што ўнутры ромба сучаснага арнаменту, з’явілася, калі нашы продкі пачалі займацца земляробствам. Цікава, што ў Кітае іерогліф “поле” таксама ўяўляе з сябе чатырохкутнік з перакрыжаваннем унутры. Але наша “поле” да таго ж яшчэ і засеяна зярняткамі – кропкамі. З часоў неаліту (4 – 2 тыс.гадоў назад) захаваліся рытуальныя статуэткі жанчын са знакам засеянага поля на жываце. З таго часу выява парадзіхі, апроч сімвала жыцця, стала яшчэ і сімвалам урадлівасці. У вышыўках гэта выява дашла да нас у выглядзе цэнтральнай часткі нашага арнаменту і ў славян асацыіруе з багіняй Ладай.

Чырвоны колер у сучаным беларускім сцягу сімвалізуе: прыродную чырвоную фарбу (охру), якой карысталіся першабытныя паляўнічыя часоў палеаліта, якія пражывалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Лічыцца, што яна асацыіруе з агнём ці сонцам; найчасцейшы колер харугвей Вялікага Княства Літоўскага; пралітую кроў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі, які пачаўся прыкладна ў другой палове XIX века; пануючы стан чырвонага колеру ў СССР.

Зялёны колер сімвалізуе: адно з бостваў славян-земляробцаў Маці-Сырую-Зямлю, звязаную з расліннасцю; племя дрыгавічоў, якое пражывала на поўдні сучаснай Беларусі і, як сцвярджаюць некаторыя гісторыкі, атрымаўшыя сваю назву ад асаблівасцей мясцовасці, у якой жылі; лясы і балоты Беларусі; вясенняе абуджэнне прыроды пасля зімы.

Белы колер, які выкарыстоўваецца ў якасці асновы арнаменту, сімвалізуе: святло палудневага сонца; гасціннасць беларусаў; свабоду, чысціню і шчаслівасць краіны; назву краіны (“Белая Русь”).

Не з простага графічнага спалучэння геаметрычных фігур складаецца арнамент на сцягу нашай краіны. Ён не звычайнае ўпрыгожванне, а элемент, які нясе асноўны сэнсавы цяжар усяго сцяга. Гэта – наш абярог.

Репозиторий ГрГМУ